ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1984

18 КАСТРЫЧНІКА

ЧАЦВЕР

№ 27 (1440)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### ПРАПАГАНДА ЛІТАРАТУРЫ

— адна з асноўных задач аддзела масавай работы бібліятэкі. Яго супрацоўнікі па[..]янна знаёмяць студэнтаў з [н]авінкамі савецкай і белару[с]кай літаратуры, з лепшымі [з]амежнымі выданнямі. Нядаўна на гістарычным факультэце быў праведзены агляд літаратуры на тэму: «Балгарская кніга ў Беларусі». Студэнты-гісторыкі даведаліся аб тым, як выдаюцца творы балгарскіх аўтараў у нас, аб культурных сувязях беларускага і балгарскага народаў, аб перакладальніцкай дзейнасці Н. Гілевіча, які адкрыў беларускім чытачам балгарскую паэзію.

Супрацоўнікі аддзела расказалі аб папулярных балгарскіх празаіках, іх кнігах на беларускай мове.

Р. ЛЯХОВІЧ, загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі.

### ПАЧАЛІСЯ СПАБОРНІЦТВЫ

1 тура II этапа круглагадовай спартакіяды інтэрнатаў універсітэта. Першымі змагаліся футбалісты. Спаборніцтвы прахо[д]зілі ў дзвюх падгрупах. У фі[н]але за 1 і 2 месцы сустрэліся [к]аманды інтэрнатаў № 7 і № 3. Перамога дасталася камандзе інтэрната № 7.

П. ЛАПЦЁНАК, намеснік старшыні студэнцкага прафкома.

### ПАТРАБУЮЦЦА ТАЛЕНТЫ

калектывам мастацкай самадзейнасці універсітэта: народнаму ансамблю танца «Крыжачок», народнай агітбрыгадзе, народнаму аркестру народных інструментаў, народнаму студэнцкаму тэатру, народнай харавой капэле, фальклорна-этнаграфічнаму ансамблю «Неруш», студыі бальнага танца, студыі пантамімы, аркестравай групе народнага ансамбля танца «Крыжачок», духавому аркестру. Першакурснікаў з нецярпеннем чакаюць у студэнцкім клубе.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### НА СВЯТКАВАННЕ

35-годдзя ўтварэння ГДР у Йенскі універсітэт імя Ф. Шылера выязджаў народны ансамбль танца «Крыжачок». У культурным цэнтры Йены яны далі канцэрт для выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта, а таксама выступілі з канцэртнымі праграмамі ў воінскай часці, на адкрытай пляцоўцы перад жыхарамі горада.

У рамках экскурсійнай праграмы універсітэцкія артысты наведалі Веймар і іншыя гарады ГДР.

У. МАКАРЭВІЧ, дырэктар студэнцкага клуба.

# ГІСТАРЫЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ — 50 ГАДОЎ

**1 снежня 1934 года празвінеў званок для 70 студэнтаў першага набору гістфака. Восем выкладчыкаў трох кафедраў (гісторыі СССР і БССР, усеагульнай гісторыі і сацыяльна-эканамічных дысцыплін) пачалі новы навучальны год на новым факультэце.**

**Ужо паўстагоддзя гістарычны факультэт паспяхова выконвае свае высокія абавязкі. Ён стаў шырока вядомым у нашай краіне цэнтрам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.**

ЗА 50 ГАДОЎ факультэт падрыхтаваў больш за 7 тысяч высокакваліфікаваных гісторыкаў, філосафаў, палітэканомаў. Імёны многіх педагогаў, вучоных, грамадскіх дзеячаў добра вядомы ў нашай рэспубліцы і краіне. Сярод выпускнікоў факультэта — сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, старшыня Дзяржаўнага камітэта СССР па замежнаму турызму П. А. Абрасімаў, міністры БССР М. М. Мяшкоў, М. Г. Мінкевіч, першы сакратар ЦК ЛКСМБ Н. Мазай, дырэктары інстытутаў, члены - карэспандэнты АН БССР Я. М. Бабосаў, С. В. Марцалеў, П. Ц. Петрыкаў, рэктары ВНУ, прафесары Н. Г. Краснова, А. Ц. Караткевіч, В. М. Пузікаў і многія іншыя.

Сёння на чатырох аддзяленнях стацыянара, вячэрняга і завочнага аддзяленняў гістарычнага факультэта вучыцца каля 2 тысяч студэнтаў і сярод іх— моладзь з 26 краін свету і пасланцы ўсіх рэспублік нашай Радзімы — каля 50 нацыянальнасцей.

Вучэбна - выхаваўчую і навукова - даследчую работу на аддзяленні гісторыі ажыццяўляюць шэсць кафедраў: гісторыі БССР, гісторыі СССР дасавецкага перыяду, гісторыі СССР эпохі сацыялізму, новай і навейшай гісторыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. Прафіліруючымі кафедрамі на аддзяленні філасофіі з'яўляюцца кафедра марксісцка - ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, на аддзяленні палітэканоміі — кафедра палітычнай эканоміі гуманітарных факультэтаў, на аддзяленні гісторыі КПСС — кафедра гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.

Вучэбную і навуковую работу вядуць 62 выкладчыкі шасці кафедраў факультэта і больш за 120 выкладчыкаў агульнауніверсітэцкіх кафедраў, сярод якіх 15 прафесараў, доктараў навук, 98 дацэнтаў, кандыдатаў навук. Яны ўзбройваюць студэнтаў ведамі, прывіваюць ім навыкі навуковага пошуку. Кожны навучальны год завяршаецца не толькі выпускам новага атрада маладых спецыялістаў, але і новымі навуковымі распрацоўкамі, апублікаваннем цікавых даследаванняў, абаронай дысертацый. Толькі за пасляваенны перыяд больш за 300 выпускнікоў факультэта абаранілі кандыдацкія дысертацыі і каля 40 сталі доктарамі гістарычных і філасофскіх навук. Сярод выхаванцаў факультэта больш за 100 заслужаных настаўнікаў БССР і заслужаных работнікаў вышэйшай школы.

Неад'емным элементам вучэбнага працэсу на факультэце стала таксама навукова-даследчая работа студэнтаў. Пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў яны выконваюць курсавыя і дыпломныя праекты, удзельнічаюць у рабоце студэнцкага навуковага таварыства, выступаюць з дакладамі на навуковых канферэнцыях, дасылаюць свае работы на універсітэцкія, рэспубліканскія і ўсесаюзныя агляды. У апошнія гады студэнты факультэта ўдзельнічалі ў рабоце канферэнцый у Маскве, Ленінградзе, Горкім, Вільнюсе, Тарту, Казані, Новасібірску, Ерэване, выступалі на навуковых канферэнцыях у НРБ і ГДР. З вялікай цікавасцю маладыя даследчыкі распрацоўваюць праблемы сацыялістычнага

(Заканчэнне на 2-й стар.).



Фотарэпартаж Аляксандра Валошына з гістарычнага факультэта чытайце на 2—3 старонках газеты.

## • СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЕ

# ВАЖНАЯ ПАДЗЕЯ

РАШЭННЕМ БЮРО камітэта камсамола універсітэта на 2—4 курсах справаздачна-выбарныя сходы павінны прайсці ў адзін дзень — 21 кастрычніка разам з грамадска-палітычнай атэстацыяй удзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» і атэстацыяй па ГПП. Практыка правядзення такога дня ў мінулым годзе паказала, што падобнае сумяшчэнне ў цэлым па універсітэту пазбавіла камсамольскія арганізацыі груп ад лішняй мітусні і садзейнічала далейшаму арганізацыйнаму ўмацаванню камсамольскай арганізацыі універсітэта.

З гэтага навучальнага года ўводзіцца асабісты комплексны план удзельніка Ленінскага заліку на ўвесь перыяд навучання, які будзе захоўвацца ў студэнта на працягу пяці гадоў, як заліковая кніжка і студэнцкі білет.

Ва універсітэце склалася практыка правядзення атэстацыі па ГПП у. рамках грамадска-палітычнай атэстацыі па Ленінскаму заліку. У ВНУ яны супадаюць і па мэце, і па зместу, і па форме.

У гэты дзень у камітэтах камсамола факультэтаў і універсітэта будуць працаваць штабы па правядзенню гэтай грамадска-палітычнай акцыі. Сходы наведаюць партыйныя, камсамольскія, савецкія работнікі горада і рэспублікі.

Камітэт камсамола універсітэта спадзяецца на ўзаемаразуменне, давер, такт камсамольцаў адзін да аднаго, жаданне шчыра дапамагчы таварышу вызначыць сваё месца ў калектыве групы, факультэта, свае індывідуальныя здольнасці і рэзервы.

**А. ВІНІЧУК, намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце.**

# ГІСТАРЫЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ — 50 ГАДОЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

і камуністычнага будаўніцтва ў СССР, міжнароднага рабочага і маладзёжнага руху, сацыялогіі і гаспадарчага будаўніцтва, удзельнічаюць у напісанні гісторыі гарадоў, раёнаў, устаноў і прадпрыемстваў.

Дэканат, кафедры, партыйная і грамадскія арганізацыі факультэта ўдзяляюць вялікую ўвагу выхаваўчай рабоце.

У адпаведнасці з патрабаваннямі XXV і XXVI з'ездаў КПСС на факультэце ажыццяўляецца комплексны падыход да выхавання, які спалучае намаганні светапогляднай накіраванасці вучэбнага працэсу, арганізацыю палітычнай адукацыі з актыўным удзелам студэнтаў у грамадскім жыцці, выпрацоўкай у іх актыўнай жыццёвай пазіцыі. Студэнты факультэта авалодваюць навыкамі прапаганды палітыкі КПСС, грамадскай і арганізатарскай работы.

Агульнае кіраўніцтва грамадскім жыццём на факультэце ажыццяўляе партыйная арганізацыя. У яе саставе больш за 200 камуністаў — выкладчыкаў і студэнтаў. У сваёй рабоце яна абапіраецца на камітэт камсамола факультэта, які разам з партыйным бюро праводзіць усе масавыя мерапрыемствы.

Важная роля ў грамадскім жыцці факультэта належыць прафсаюзным арганізацыям студэнтаў і супрацоўнікаў, якія актыўна займаюцца вырашэннем вытворчых, культурных, бытавых задач, палітыка-выхаваўчай работай, арганізацыяй сацыялістычнага спаборніцтва.

Партыйная і грамадскія арганізацыі факультэта праводзяць вялікую работу па патрыятычнаму, інтэрнацыянальнаму, працоўнаму, эстэтычнаму выхаванню студэнцкай моладзі. Частымі гасцямі факультэта бываюць ветэраны партыі, героі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, перадавікі вытворчасці, пісьменнікі, артысты. Факультэт падтрымлівае цесныя кантакты з многімі прадпрыемствамі Мінска, школамі Стаўбцоўскага і Уздзенскага раёнаў, аказвае дапамогу настаўнікам Мінска ў ідэйна-выхаваўчай рабоце, удзельнічае ў падрыхтоўцы экскурсаводаў для школьных музееў.

Цэнтрам інтэрнацыянальнай работы з'яўляецца інтэрклуб, у састаў якога ўваходзяць савецкія і замежныя студэнты. Інтэрклубам аформлены аўдыторыі савецка-германскай і савецка-балгарскай дружбы, інтэрпакой у інтэрнаце. Пад яго кіраўніцтвам праводзяцца інтэрнацыянальныя вечары адпачынку, сустрэчы, дыспуты.

У студэнцкае жыццё трывала ўвайшоў трэці працоўны семестр. Штогод у час летніх канікулаў студэнцкія будаўнічыя атрады факультэта выязджаюць на будоўлі БАМа, Комі АССР, Пскоўскай вобласці, Малдавіі, Беларусі, ГДР, НРБ, дзе ўзводзяць аб'екты вытворчага і сацыяльна-бытавога прызначэння. У будаўнічых атрадах студэнты атрымліваюць сур'ёзную працоўную загартоўку, набываюць навыкі арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы.

Сёння гістарычны факультэт нельга ўявіць без яго шырокіх сувязей з універсітэтамі Масквы і Ленінграда, Кіева і Харкава, Львова і Вільнюса, Гомеля і Гродна, з інстытутамі гісторыі АН СССР і АН БССР, без пастаянных кантактаў з Йенскім (ГДР), Сафійскім (НРБ), Ягелонскім (ПНР), Люблянскім (СФРЮ) і іншымі універсітэтамі.

Калектыў гістарычнага факультэта прыкладае ўсе намаганні, каб паспяхова вырашаць задачы, пастаўленыя XXVI з'ездам КПСС, чэрвеньскім (1983 г.) Пленумам ЦК КПСС перад вышэйшай школай у справе падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў-грамадазнаўцаў.

**І. ЦАРУК,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**

● ФОТАРЭПАРТАЖ ●

## ДНІ, ЯК УСЕ ІНШЫЯ





**...БУДНІ ФАКУЛЬТЭТА. Асабліва напружаныя яны ў гэтыя дні — напярэдадні святкавання 50-годдзя гістфака. Патрэбна паспець зрабіць усё: апошні раз прарэпеціраваць нумары мастацкай самадзейнасці, выпусціць насценгазеты і аформіць стэнды. Словам, належным чынам падрыхтавацца да прыёму гасцей: студэнтаў розных гадоў, ветэранаў, былых выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія наведваюць у юбілейныя дні факультэт.**

● СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ

## «АДКРЫЎ ДАРОГУ Ў ЖЫЦЦЁ»

ГІСТАРЫЧНЫ факультэт за сваю паўвекавую гісторыю выхаваў плеяду вядомых вучоных, шматлікі атрад настаўнікаў, партыйных і савецкіх работнікаў. Кожны выпускнік, у якой бы сферы ён ні працаваў, ганарыцца сваім факультэтам, яго дасягненнямі. Напярэдадні 50-гадовага юбілею хочацца выказаць словы падзякі ўсім выкладчыкам гістфака.

Мы, выпускнікі, удзячны педагагічнаму калектыву факультэта за тое, што ў сваю працоўную дзейнасць уступілі з неабходнай тэарэтычнай падрыхтоўкай і ведамі. Апынуўшыся сярод палітэканомаў, я па-новаму асэнсоўвала навуку гісторыі і навуку працы, якія спасцігаліся ў студэнцкія гады, і тады па-сапраўднаму ацаніла намаганні сваіх педагогаў.

Дзякуй табе, факультэт, за адкрытую дарогу ў жыццё!

**М. САКОВІЧ,**
**дацэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў.**

● ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР ●

# НАВУКОВАЙ ЗМЕНЕ — ГАЛОЎНЫ КЛОПАТ

**Кафедра новай і навейшай гісторыі створана праз тры гады пасля адкрыцця гістарычнага факультэта. З 1937 года ёю загадвае доктар гістарычных навук, прафесар Л. М. Шнеерсон. Сёння ён — заслужаны дзеяч навукі рэспублікі. Кафедра — адна з вядучых на факультэце. Яна забяспечвае навучанне студэнтаў на старэйшых курсах, з'яўляецца адной з самых кваліфікаваных па саставу выкладчыкаў, пастаянна вядзе падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі — доктараў і кандыдатаў навук.**

**— Леў Міхайлавіч, чым, на Ваш погляд, тлумачацца поспехі ў рабоце кафедры?**

— Складаемых поспеху шмат. Важнейшая ўмова — падрыхтоўка кадраў. Іх мы выхоўваем для сябе самі. Падрыхтоўку кадраў з ліку студэнтаў мы пачынаем з таго часу, калі ўводзіцца спецыялізацыя. Ёсць шмат крытэрыяў адбору аспірантаў. Напрыклад, грамадская актыўнасць і веданне замежнай мовы. Але, зразумела, на першым месцы стаіць узровень падрыхтоўкі.

**— Колькі кандыдатаў навук падрыхтавана асабіста Вамі?**

— 15 кандыдатаў навук, сярод іх — спецыялісты для Гомельскага і Гродзенскага універсітэтаў.

**— Студэнты часта гавораць аб асобай атмасферы на кафедры. Ці так гэта?**

— Атмасфера ў многім залежыць ад рашаемых кафедрай навуковых праблем. Мы займаемся даволі складанымі навуковымі пытаннямі. Гэта праблемы міжнародных адносін эпохі імперыялізму, сучаснасці, пытанні камуністычнага і рабочага руху і г. д., што ў сваю чаргу патрабуе адпаведнага інтэлектуальнага рэагавання. Студэнты ўжо на лекцыях нібы «дыхаюць» гэтым паветрам складанасці і адпаведна рэагуюць больш грунтоўнай падрыхтоўкай.

**— Над чым працуе Ваша кафедра цяпер?**

— Рад навуковых тэм шырокі і цікавы. У адпаведнасці з рашэннямі XXVI з'езда КПСС і чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС выдаём серыю кніг для шырокага кола чытачоў, у тым ліку для прапагандыстаў. Ужо выйшла кніга «XXVI з'езд КПСС аб сусветным рэвалюцыйным працэсе», здадзена ў друк кніга «Вялікая Перамога і сусветны рэвалюцыйны працэс», задумана трэцяе выданне гэтай серыі. Акрамя таго, для прапагандыстаў, студэнтаў рыхтуецца да выдання «Хроніка класавай барацьбы» у новы і навейшы час, якая ахоплівае краіны Еўропы і Амерыкі, а таксама Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Сумесная работа яшчэ больш згуртоўвае наш калектыў.

**— Леў Міхайлавіч, каго з Вашых вучняў Вы маглі б адзначыць?**

— Зрабіць гэта цяжка. Сказаць пра аднаго, значыць пакрыўдзіць другога. Усе таленавітыя па-свойму. Скажу толькі, што яны — выхаванцы нашай кафедры. Сярод іх ёсць партыйныя і савецкія работнікі, дыпламаты, дзеячы вышэйшай школы.

**На некалькі пытанняў карэспандэнта адказаў заслужаны работнік вышэйшай школы рэспублікі, доктар гістарычных навук, прафесар Р. М. Трухноў.**

**— Вядома, што Вамі падрыхтавана амаль 20 кандыдатаў навук. Што Вы робіце для таго, каб Вашы аспіранты закончылі вучобу паспяхова, інакш кажучы, абаранілі дысертацыі?**

— Поспех забяспечвае жывы штодзённы кантакт. Безумоўна, важным застаецца адбор студэнтаў для будучай навуковай работы з тых, якія пішуць пад маім кіраўніцтвам курсавыя і дыпломныя, работы ў рамках студэнцкага навуковага таварыства. І, зразумела, неабходны кантроль. Кантроль своеасаблівы, у сэнсе цесных навуковых сувязей са студэнтамі і аспірантамі, калі дасягаецца ўзровень узаемаадносін, якія не патрабуюць загадаў.

**— Наколькі Вашы навуковыя інтарэсы супадаюць з інтарэсамі Вашых вучняў?**

— Супадаюць навуковыя напрамкі, у тым ліку з напрамкамі кафедры ў цэлым. Канкрэтна работа з маімі вучнямі ідзе па праблемах савецка-германскіх адносін у перыяд паміж дзвюмя сусветнымі войнамі, германскай гісторыі і гісторыі нямецкага рабочага руху, гісторыі сацыялістычных краін. Частка праблем, што вырашаюцца аспірантамі, выходзіць за межы толькі «маёй» тэматыкі. Гэта заўсёды адабраецца.

**— Рыгор Маркавіч, які асноўны прынцып Вашай работы з навуковай зменай?**

— Вы самі адказалі на гэта пытанне. Клопаты аб навуковай змене — гэта работа, работа індывідуальная, няпростая, але ўдзячная.

**Інтэрв'ю правёў**
**М. ГЕРАСІМАЎ.**



НА ЗДЫМКАХ: ✦ Хутка званок.
✦ Віктар Агароднік, студэнт 4 курса аддзялення гісторыі, выдатна вучыцца, шмат часу аддае камсамольскім справам. Ён атрымлівае стыпендыю імя Джона Бернала.
✦ Афармленне стэндаў да юбілею.
✦ У час лекцыі (гл. 1 стар).
Фота А. ВАЛОШЫНА.

● СЛОВА ПРА НАСТАЎНІКА ●

# І СЭРЦА ЦЕПЛЫНЮ...

**Я ўпершыню сустрэлася з Уладзімірам Мікалаевічам Перцавым у 1953 годзе, калі была студэнткай 4 курса гістарычнага факультэта. Прафесар У. М. Перцаў чытаў у той час для нашай групы спецыяльныя курсы — «Крыніцазнаўства гісторыі сярэдніх вякоў» і «Ідэалогія раннефеадальнага грамадства». У гэты перыяд Уладзімір Мікалаевіч узначальваў аддзяленне грамадскіх навук АН БССР і адначасова загадваў кафедрай гісторыі сярэдніх вякоў у нашым універсітэце.**

ЛЕКЦЫІ Уладзіміра Мікалаевіча былі насычаны навуковым матэрыялам, вызначаліся глыбокай эрудыцыяй. Ён чытаў спакойна, аналізуючы факты і падзеі, заўсёды падводзіў слухачоў да асноўнага вывада. Часам для разрадкі расказваў які-небудзь цікавы эпізод.

Уладзімір Мікалаевіч прымаў актыўны ўдзел у грамадскіх справах факультэта, выступаў з лекцыямі, у якіх дзяліўся сваім вялікім вопытам навуковай і педагагічнай работы. На сустрэчах са студэнтамі, у навуковых студэнцкіх гуртках праводзіў гутаркі.

У той час я не думала, што гэты чалавек адыграе такую ролю ў маім лёсе. У 1954 годзе, скончыўшы з адзнакай універсітэт, я была накіравана на работу ў Лапічаскую сярэднюю школу Асіповічскага раёна. Папрацавала ў школе тры тыдні і раптам атрымоўваю тэлеграму ад Уладзіміра Мікалаевіча: «Тэрмінова прыязджайце здаваць экзамены ў аспірантуру. Ваша вызваленне ад работы ўзгоднена з Міністэрствам асветы».

У У. М. Перцова быў свой метад работы з аспірантамі. Акрамя здачы кандыдацкіх экзаменаў, аспірант па асобай праграме авалодваў спецыяльнасцю. Уладзімір Мікалаевіч лічыў, што будучы выкладчык павінен дасканала вывучыць літаратуру па свайму профілю — работы рускіх дарэвалюцыйных вучоных, замежных і савецкіх аўтараў, а таксама ўвесь крыніцазнаўчы матэрыял. З першага дня заняткаў ён кожны месяц даваў мне спіс літаратуры (5—6 работ), а потым запрашаў на гутарку.

У. М. Перцаў быў вельмі заняты чалавек — выйшла ў свет яго работа «Германія ў XVIII стагоддзі», ён пісаў вялікія раздзелы для першага тома «Гісторыі БССР» і рэдагаваў гэта выданне, працаваў над нарысамі «Гістарычная думка ў Беларусі», але для аспірантаў заўсёды знаходзіў час. Не было выпадку, каб ён перанёс ці адмяніў кансультацыю, не прачытаў у вызначаны тэрмін раздзела дысертацыі. Уладзімір Мікалаевіч быў выключна адданы навуцы, глыбока ўсведамляў свой навуковы і грамадскі абавязак, з вялікай любоўю адносіўся да людзей, аддаваў ім сваю дабрату, цеплыню свайго сэрца.

**Н. ГУСАКОВА,**
**загадчыца кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.**

● СЛОВЫ ЎДЗЯЧНАСЦІ ●

# «РАСКАЖУ СВАЙМУ НАРОДУ»

ЧАТЫРЫ ГАДЫ назад я паступіў на гістарычны факультэт. Тут я змог вывучыць працы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна. Я даведаўся, якую ролю адыграў савецкі народ у барацьбе з фашызмам у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пераканаўся ў міралюбівай палітыцы КПСС і Савецкай дзяржавы, у ветлівасці і добразычлівасці савецкіх людзей.

Незаўважна хутка ляціць час. Не паспееш азірнуцца і патрэбна будзе вяртацца на радзіму. Аб усім гэтым я і раскажу свайму народу.

**Луіс ПІМЕНТЭЛЬ,**
**студэнт гістарычнага факультэта.**

● АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ЭКСПЕДЫЦЫІ ●

# ТАМ, ДЗЕ ПАЧЫНАЕЦЦА НЯЗВЕДАНАЕ

**УВЯДЗЕННЕ ў пасляваенны час у вучэбны план гістарычных факультэтаў універсітэтаў абавязковай археалагічнай практыкі і стварэнне ў 1973 годзе кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін зрабілі Беларускі універсітэт адным з буйнейшых цэнтраў археалагічных даследаванняў у рэспубліцы і ўладальнікам вялікай і каштоўнай калекцыі старажытных рэчаў.**

**Да 1962 года студэнты гістарычнага факультэта прымалі ўдзел у археалагічных раскопках, якія праводзіліся пераважна Акадэміяй навук БССР. З 1962 года пачаліся рэгулярныя раскопкі універсітэцкай экспедыцыяй. Аб'ектамі вывучэння сталі галоўным чынам помнікі эпохі Кіеўскай Русі.**

АСОБНАЕ значэнне маюць чатырохгадовыя раскопкі пад Мінскам каля вёскі Гарадзішча, дзе знойдзена вялікае ўмацаванае пасяленне, якое атаясамлівалася некаторымі вучонымі са старажытнейшым Мінскам. Аднак раскопкамі было даказана, што ўмацаванні на ім узведзены толькі ў XIV—XV стагоддзях, а да гэтага там было невялікае неўмацаванае пасяленне сельскага тыпу і да Мінска ніякага дачынення не мела. Разам з тым раскопкі давалі каштоўны археалагічны матэрыял, які расказваў аб стане земляробства ў заходніх землях Русі ў самы пачатковы перыяд яе гісторыі. Было знойдзена шмат землеапрацоўчых прылад (наканечнікі рала, матыкі, сохі), сярпы, жорны, абгарэлае збожжа. Раскопкі паказалі высокі ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці ва ўсходніх славян, шырокі асартымент культур, якія сеяліся ў гэты час.

Унікальныя раскопкі на працягу апошніх васьмі гадоў гістфак праводзіць на феадальным замку каля вёскі Вішчын недалёка ад Рагачова. Ужо раскапана звыш паловы плошчы замка. Устаноўлена, што гэта быў добра ўмацаваны двор буйнага феадала, пабудаваны ў пачатку XII і цалкам разбураны і спалены ў сярэдзіне XIII стагоддзя. Пасля гэтага пасяленне больш не адбудоўвалася. Рэшткі замка і ўсяго таго, чым семсот гадоў назад карысталіся яго жыхары, ляжыць пад травой, амаль на паверхні. Знойдзены рэшткі згарэўшых жылых і гаспадарчых пабудоў, драўляная крапасная сцяна, разнастайныя рэчы. Сярод іх шмат зброі і упрыгожанняў. У замку былі развіты і рамёслы: кавальскае і асабліва ювелірнае. Знойдзена некалькі матрыц для вырабу складаных па тэхналогіі і дарагіх упрыгожанняў. У 1979 годзе сярод каменняў ля крапаснай сцяны быў знойдзены закапаны ў XIII стагоддзі скарб сярэбраных грашовых зліткаў і княжацкіх упрыгожанняў. Такіх скарбаў у Беларусі яшчэ ніхто не знаходзіў.

Феадальным замкам было, напэўна, і ўмацаванае пасяленне каля вёскі Свіслач, даследаванні на якім экспедыцыя БДУ праводзіла на працягу чатырох гадоў. Вывучэнне уладальніцкіх феадальных дамоў — новы напрамак у археалогіі Беларусі. Раскопкі ў Вішчыне і Свіслачы даюць цікавы матэрыял для вывучэння праблемы генезісу рускага феадалізму.

З гісторыяй сярэднерускай вёскі звязаны і курганы, раскопкі якіх праводзяцца экспедыцыяй БДУ амаль кожны год. Курганы даследаваліся пад Мінскам (Сенніца, Заслаўль, Нялідавічы, Лысая Гара) і Рагачовам (Мадора, Гадзілавічы, Вішанка). Курганныя матэрыялы дазваляюць прасачыць нормы і звычаі вясковага насельніцтва, стан сельскага рамяства. Вельмі важныя даныя аб перажытках племяннога дзялення. Раскопкі добра ілюструюць маёмасную розніцу паміж жыхарамі замкаў і звычайным сельскім насельніцтвам.

З аддаленых часоў важнай магістраллю, па якой ішло рассяленне старажытных плямён, быў Днепр, а ў эпоху Старажытнай Русі — гэта адзін з найбольш ажыўленых гандлёвых шляхоў. Тут склаліся спрыяючыя ўмовы для развіцця рамёслаў і гандлю, якія вызначалі ўзнікненне гарадоў. Рускія летапісы называюць у цячэнні Дняпра пяць гарадоў: Оршу, Копысь, Рагачоў, Стрэшын і Рэчыцу. У першых чатырох былі праведзены раскопкі экспедыцыяй БДУ. Першапачатковая гісторыя гэтых гарадоў аказалася вельмі падобнай. Усе яны ўзніклі ў другой палове XI стагоддзя і былі спачатку невялікімі умацаванымі пасяленнямі, што стаялі на мяжы паміж замкамі і гарадамі. Раней за іншых ператварыліся ў гарады Орша і Копысь. Цікава, што гэтыя два гарады, мяркуючы па летапісу, былі равеснікамі Мінска. Археалагічны матэрыял з ранніх слаёў Оршы і Копыся аказаўся аналагічным мінскаму. Дарэчы, на працягу многіх гадоў БДУ імя У. І. Леніна разам з інстытутам гісторыі АН БССР удзельнічае ў археалагічных раскопках старажытнага Мінска.

Некаторыя пасяленні Старажытнай Русі ўтварыліся на месцы гарадзішчаў жалезнага веку. У час раскопак гарадзішчаў пад Мінскам, у Дзяржынску, Свіслачы, Рагачове быў атрыманы багаты матэрыял па гісторыі плямёнаў І тысячагоддзя да н. э. — І тысячагоддзя н. э. Вялікія раскопкі былі праведзены і спецыяльна на некаторых гарадзішчах жалезнага веку (Жыжлянка на Свіслачы, Кісцені пад Рагачовам). Усё гэта дапамагло стварыць вялікі фонд археалагічных крыніц па старажытнай гісторыі Беларусі, з якімі паспяхова працуюць і выкладчыкі, і студэнты гістарычнага факультэта. Частка атрыманага матэрыялу выкарыстана для стварэння археалагічнай экспазіцыі ў музеі БДУ.

**Э. ЗАГАРУЛЬСКІ,**
**загадчык кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.**



● ЛЕКЦЫЙНАЯ ПРАПАГАНДА

# Наш грамадзянскі абавязак

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ СССР эпохі сацыялізму вялікую ўвагу ўдзяляе прапагандзе гістарычных ведаў сярод насельніцтва рэспублікі. Толькі за перыяд са студзеня да чэрвеня гэтага года яе супрацоўнікі прачыталі ў калектывах больш за 130 лекцый, правялі канферэнцыі і семінары. У сакавіку гэтага года члены кафедры ажыццявілі калектыўны выезд на Мінскі аўтамабільны завод, дзе выступілі з лекцыямі «Барацьба працоўных Мінска супраць нямецка - фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны», «Вынікі і ўрокі Вялікай Айчыннай вайны», «Барацьба працоўных Бліжняга і Сярэдняга Усходу за нацыянальную незалежнасць».

Актыўнымі членамі таварыства «Веды» з'яўляюцца кіраўнік секцыі лектараў-міжнароднікаў БДУ дацэнт К. І. Осіпаў, лектар па ваенна-патрыятычнай тэматыцы дацэнт Л. А. Міхайлоўскі. Яны прымаюць актыўны ўдзел у ваенна-патрыятычным выхаванні студэнцкай моладзі. На працягу многіх гадоў з лекцыямі для слухачоў універсітэта марксізму - ленінізму Мінскага абкома КПБ выступае дацэнт І. А. Літвіноўскі. Умела прапагандуюць дасягненні ў рабоце БДУ імя У. І. Леніна і ў прыватнасці калектыву гістарычнага факультэта дацэнты Я. Ф. Саўчук і А. П. Салькоў.

Выступленні перад насельніцтвам узбагачаюць вопыт асноўнай работы кафедры па навучанню і выхаванню студэнтаў. Гэта работа сведчыць аб выкананні членамі кафедры не толькі свайго прафесійнага, але і грамадзянскага абавязку.

**У. СІДАРЦОЎ,**
**выкладчык гістарычнага факультэта.**

Асновы гістарычнай навукі ў БДУ заклаў яго першы рэктар Уладзімір Іванавіч Пічэта. Яму належыць вялікая роля ў арганізацыі і станаўленні Беларускага дзяржаўнага універсітэта — першага нацыянальнага цэнтра беларускай савецкай навукі і культуры. 8 ліпеня 1921 года Народны камісарыят асветы назначыў У. І. Пічэту рэктарам універсітэта. З вялікім энтузіязмам узяўся ён за стварэнне ў Беларусі першага цэнтра па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі і навуковых устаноў рэспублікі. За кароткі тэрмін была зроблена вялікая арганізацыйная работа па распрацоўцы планаў, падрыхтоўцы матэрыяльнай базы, памяшканняў для заняткаў, камплектаванню бібліятэкі. Адной з заслуг У. І. Пічэты на пасадзе рэктара было стварэнне кадраў высокакваліфікаваных выкладчыкаў. У якасці прафесараў, дацэнтаў і выкладчыкаў універсітэта былі запрошаны буйнейшыя вучоныя краіны, відныя партыйныя і дзяржаўныя дзеячы.

# І ТАЛЕНТАМ, І ПРАЦАЙ

РАЗАМ з напружанай арганізатарскай дзейнасцю У. І. Пічэта вядзе вялікую выкладчыцкую работу. Ён чытае лекцыі па гісторыі Беларусі, гісторыі народнай гаспадаркі Расіі, гісторыі беларускага права, гісторыі славян. Уменне эмацыянальна, жыва і разам з тым проста расказаць аб складаных праблемах гістарычнага працэсу выклікалі цікавасць да яго лекцый не толькі студэнтаў, але і шырокага кола беларускай інтэлігенцыі.

Знаходжанне У. І. Пічэты ў Мінску, яго вялікая навуковая, педагагічная, грамадская работа пакінулі глыбокі след у развіцці вышэйшай адукацыі, асветы, культуры Беларусі.

Мінскі перыяд (1921—1930 гг.) жыцця У. І. Пічэты быў адным з найбольш плённых у яго творчай дзейнасці. Перад беларускай савецкай гістарычнай навукай у перыяд яе станаўлення стаялі важныя і цяжкія задачы. Неабходна было вызначыць шляхі яе развіцця, даць ацэнку фактычнаму матэрыялу і папярэдняй гістарычнай літаратуры з пазіцый марксісцка-ленінскай метадалогіі. У. І. Пічэта ў сваіх работах вызначыў напрамкі навуковых даследаванняў гісторыі нашай рэспублікі, якімі даследчыкі працягваюць займацца і сёння.

Адно з цэнтральных месц у творчай спадчыне У. І. Пічэты займала гісторыя Беларусі. Каля 150 яго работ прысвечаны сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, гісторыі феадальнага права, крыніцазнаўству і культуры Беларусі. Вядучае месца ў даследаваннях У. І. Пічэты па гісторыі Беларусі займае аграрная праблема. Яго работы па гісторыі Беларусі аказалі вялікі ўплыў на развіццё навукова-даследчай работы ў галіне сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі эпохі феадалізму, садзейнічалі стварэнню манаграфічнай літаратуры. Многія праблемы, пастаўленыя ў работах У. І. Пічэты і не вырашаныя ім, паспяхова вырашаюцца ў даследаваннях сучасных беларускіх гісторыкаў.

Вялікі ўклад вучонага ў распрацоўку гісторыі беларускай культуры XV—XVII стагоддзяў. Напісаныя ім артыкулы «Беларускае адраджэнне ў XVI стагоддзі», «Друк Беларусі ў XVI—XVII стагоддзях», «Францыск Скарына і яго працы» і іншыя далі накіроўваючую лінію для даследаванняў беларускіх гісторыкаў па праблемах грамадска-палітычнага і культурнага развіцця эпохі феадалізму.

У. І. Пічэта быў адным са стваральнікаў школы савецкага славяназнаўства. Значная частка яго навуковых работ па гісторыі Чэхіі, Сербіі, Балгарыі, Харватыі былі першымі марксісцкімі даследаваннямі ў галіне славяназнаўства.

У 1939 годзе па ініцыятыве У. І. Пічэты ў Інстытуце гісторыі акадэміі навук СССР быў створаны сектар славяназнаўства, а на гістарычным факультэце Маскоўскага універсітэта — першая ў краіне кафедра гісторыі паўднёвых і заходніх славян. Сектар і кафедру ўзначаліў У. І. Пічэта. У студзені 1947 года пры яго актыўным удзеле быў створаны Інстытут славяназнаўства АН СССР (сёння Інстытут славяназнаўства і балканістыкі АН СССР).

Не толькі працай і талентам, але і вялікімі арганізацыйнымі здольнасцямі, навуковым натхненнем і навуковым энтузіязмам было дасягнута ўсё тое, што засталося пасля У. І. Пічэты нашай сённяшняй і будучай гістарычнай навуцы.

**Л. СУШКЕВІЧ,**
**выкладчыца гістарычнага факультэта.**

# ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ЮБІЛЕЮ

**Безумоўна, пяцідзесяцігадовы юбілей заўсёды з'яўляецца гістарычнай датай. Хутка гэтую дату будзе святкаваць гістарычны факультэт. Аб тым, як ідуць справы ў камсамольцаў гістфака, як рыхтуюцца яны сустрэць юбілей свайго факультэта мы і папрасілі расказаць сакратара камітэта камсамола студэнта IV курса Ігара КРЫШТАНА. Першае пытанне, зразумела, датычыла вучобы.**

— Пытанням вучобы мы заўсёды ўдзялялі шмат увагі, і вынікі нядрэнныя. Зараз у нас разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва пад дэвізам: «50-годдзю факультэта — выдатную вучобу!». Вынікі яго яшчэ не падведзены, можна толькі сказаць, што пакуль наперадзе ідуць пяцікурснікі. Прынцыпова ставяцца камсамольцы да парушальнікаў дысцыпліны. За шэсць акадэмічных гадзін, прапушчаных без уважлівай прычыны, парушальніку рашэннем камітэта камсамола аб'яўляецца строгая вымова. Шмат часу адводзім мы рабоце з першакурснікамі. Ім, як вядома, больш чым каму патрэбна своечасовая дапамога, карысная парада старэйшых таварышаў. У камітэце камсамола факультэта ёсць адказны за першы курс, назначаны таксама грамадскія куратары груп.

Як заўсёды добра прайшоў у гэтым годзе трэці працоўны семестр. На факультэце было арганізавана сем студэнцкіх будаўнічых атрадаў, у састаў якіх увайшло больш за 250 байцоў. Яны працавалі ў Карэліі, Стаўрапольскім краі, нашай рэспубліцы.

**— Выдатная вучоба, добрая праца ў значнай ступені залежыць ад таго, як студэнты праводзяць свой вольны час. Што робіцца камітэтам камсамола ў гэтым плане?**

— У студэнцкіх інтэрнатах часта праходзяць сустрэчы з выкладчыкамі, гутаркі. Студэнтам прыйшліся па густу вечары адпачынку, прысвечаныя Новаму году, Міжнароднаму жаночаму дню і іншыя. У інтэрнатах працуюць шматлікія гурткі, кансультацыйныя пункты. Не так даўно студэнты 2 курса правялі вечар паэзіі У. Высоцкага, а на 3 курсе быў арганізаваны конкурс «А ну, дзяўчаты!». Вялікую цікавасць выклікалі фотавыстаўка, прысвечаная 40-годдзю вызвалення Беларусі, і выстаўка мастацкай творчасці студэнтаў. Такія агульныя мерапрыемствы вучаць рабят разам радавацца і перажываць.

**— Ігар, якія мерапрыемствы ў вас запланаваны да юбілею?**

— Яшчэ ў будатрадах і на сельскагаспадарчых работах нашы студэнты чыталі лекцыі аб гісторыі і сённяшнім дні факультэта. А святочныя мерапрыемствы будуць праводзіцца з 22 да 28 кастрычніка. Галоўнай падзеяй стане студэнцкая навуковая канферэнцыя, якая адбудзецца ў Доме настаўніка. На ёй вырашана ўзнавіць традыцыйныя пічэтаўскія чытанні, прысвечаныя першаму рэктару БДУ. У адным з дакладаў будзе асветлены шлях камсамольскай арганізацыі факультэта за 50 гадоў. На канферэнцыю запрошаны прадстаўнікі гістарычных факультэтаў Маскоўскага, Ленінградскага, Кіеўскага, Вільнюскага і іншых універсітэтаў. У час святочнага тыдня будзе паказаны канцэрт мастацкай самадзейнасці, у якім кожны курс выступіць са сваёй праграмай. У студэнцкім інтэрнаце адбудзецца вечар, а на паверхах факультэта — разгорнута фотавыстаўка, прысвечаная юбілею. Тут жа размесцяцца святочныя выпускі насценгазет, якія раскажуць аб дасягненнях у вучобе і працы нашых камсамольцаў. Запланаваны таксама іншыя мерапрыемствы.

Карыстаючыся выпадкам, хацелася б запрасіць на наша свята ўсіх чытачоў універсітэцкай газеты.

**Інтэрв'ю правеў**
**Д. ДРАЗДОЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

● КРОС ●

## НА ПРЫЗ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

# ВАША СЛОВА, ПЕРШАКУРСНІКІ!

«ВАША СЛОВА», —так гаварылі першакурснікам пры ўручэнні студэнцкіх білетаў, пры ад'ездзе на сельскагаспадарчыя работы, пры пачатку заняткаў. Выкладчыкам хочацца, каб новае папаўненне вучылася не горш, чым іх папярэднікі, старшакурснікі жадаюць бачыць у іх прадаўжальнікаў студэнцкіх традыцый. У нядзелю, 21 кастрычніка, «Ваша слова, першакурснікі!» скажуць трэнеры універсітэта. Так, 21 кастрычніка. Студэнты першых курсаў будуць змагацца за прыз газеты «Беларускі універсітэт».



Спаборніцтвы традыцыйныя. Юнакі будуць бегчы 1000 м, а дзяўчаты — 500. Факультэт мае права выстаўляць увесь курс, у залік жа ідзе палавіна лепшых рэзультатаў.

Кубак першых курсаў па бегу стаў своеасаблівым уступным спартыўным экзаменам. Тут праводзіцца агляд спартыўных талентаў. Але не гэта галоўнае. На спаборніцтвах ідзе ўпартая барацьба. Кожны курс хоча даказаць, што ён лепшы. Курсаў адзінаццаць, а першае месца — адно, і не ў месцы справа. Калі вы праявіце байцоўскія якасці, адказнасць за сябе і за сваіх сяброў, то, бясспрэчна, гэта стане вашай агульнай перамогай.

А цяпер напомнім вынікі папярэдніх спаборніцтваў. Пераможцамі былі:

**1979 — хімфак**
**1980 — журфак**
**1981 — гістфак**
**1982 — журфак**
**1983 — ФПМ**

У асабістым заліку лепшыя вынікі мае Андрэй Міхейкін (ФПМ), які 1000 метраў пераадолеў за 2 мінуты 43 секунды. Рэкорд кубка датуецца 1981 годам. У гэтым жа годзе Ала Пількова (фізфак) прабегла 500 метраў за 1 мін. 22 сек. Праз год Ала Трахаўцова (хімфак) паўтарыла яе вынік.

Што ж, рэкорды вядомы. На старт! Паспяшайце вам, першакурснікі!

**У. АБРАМОВІЧ,**
**наш кар.**

**НА ЗДЫМКУ:** перамożцу чакае вось гэты кубак.

## ● ВОСЕНЬСКІ МАТЫЎ



ЗНОЎ ВОСЕНЬ... Стольki чакаюць лета, каб потым зноў раскрываць парасоны і, падняўшы каўнер, хлюпаць па лужынах! Так, бывае мы гаворым і нават у спрэчцы будзем упэўніваць сябра, што так яно і ёсць — нічога незвычайнага ў гэтай шэрай восені няма.

А вам ніколі не здавалася, што гэта хутчэй думкі шэрыя, а не восень? Калі за вокнамі дождж і не хочацца нават носа высоўваць, паспрабуйце забыцца на ўсе неадкладныя справы і, абапёршыся далонямі ў халоднае шкло, зазірнуць проста ў кастрычніцкі вечар. Аб чым, цікава, думае вось тое дзіўнае дрэва, што панура стаіць ля стужкі-ракі і сумна ўзіраецца ў сваё адлюстраванне? А тая хаціна? У звычайны сонечны дзень яна такая ж, як усе іншыя, а цяпер здаецца хворым сівым дзядком. Задуменна і маўкліва стаіць вежавы кран, строгі і нерухомы, толькі маленькі ветрачок, што на самым версе вежы, гарэзліва падстаўляе свае крылы пасенняму калючаму ветру.

Дзіўнае адчуванне — быццам усё навакольнае чагосьці чакае. А чалавек? І ён жа таксама!

«Хутчэй бы ўжо канчаліся гэтыя дажджы і выпаў снег!», скардзячыся на жыццё, бурчыць бабулька. Цікава, восень — быццам прыступка. Пераступіш яе — і з залітай сонечнай ласкай паляны апынішся ў царстве снягоў і завеяў. А яшчэ восень — гэта прыступка ў сталасць. Не згодны? Спытайцеся ў першакурсніцы факультэта журналістыкі Алены Масла, яна вас упэўніць. І разам упэўніць у тым, што ў восені няма шэрых фарбаў. Толькі падрыхтуйцеся: каб зразумець гэта, патрэбна прыадкрыць сваю душу...

Тэкст і фота
**В. КАРАЛЯ.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

18 кастрычніка 1984 г.

Зак. 1655. АТ 10470

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ